# Атэстаты сталасці як крыніца інфармацыі пра Максіма Багдановіча і яго аднакласснікаў

*<u>Крыніца друкавання</u>*: Мышкавец, І. Атэстаты сталасці як крыніца інфармацыі пра Максіма Багдановіча і яго аднакласснікаў / Ірына Мышкавец // Роднае слова. – 2016. – № 6. – С. 84 – 87.



*Максім Багдановіч.1911 г.*
*З фондаў Літаратурнага музея Максіма Багдановіча.*

Творчая спадчына Максіма Багдановіча, генія беларускай літаратуры, адносіцца да самых каштоўных збораў нацыянальнай культуры, з'яўляецца неад'емнай часткай сусветнай культуры. Вывучэннем жыццёвага і творчага шляху пісьменніка займаюцца розныя навуковыя інстытуты, асобныя даследчыкі. На працягу вось ужо 35 гадоў пошукавую і даследчую працу вядуць супрацоўнікі Літаратурнага музея Максіма Багдановіча.

У кола інтарэсаў музейных работнікаў уваходзіць асоба М. Багдановіча, яго рукапісная спадчына і прыжыццёвыя публікацыі. Таксама навуковыя супрацоўнікі займаюцца пошукам інфармацыі пра бацькоў паэта, яго родных, блізкіх, сяброў, аднакласнікаў, калег. Гэтыя звесткі дапамагаюць асэнсаваць час, у які жыў і тварыў М. Багдановіч, знайсці вытокі яго творчасці, вылучыць шляхі далейшых пошукаў артэфактаў, звязаных з асобай пісьменніка.

Дакументы, якія могуць праліць святло на тыя ці іншыя аспекты жыцця М. Багдановіча, захоўваюцца ў Дзяржаўным архіве Яраслаўскай вобласці (ДАЯВ). Для даследчыкаў творчасці беларускага пісьменніка найбольш

цікавымі падаюцца наступныя фонды: “Праслаўская мужчынская гімназія імя Аляксандра I” (фонд 557) [1]; “Дзямідаўскі юрыдычны ліцэй” (фонд 571) [2]; “Сялянскі пазямельны банк” (фонд 516) [3]. Дзве першыя ўстановы непасрэдна звязаны з Максімам Багдановічам: у гімназіі беларускі паэт вучыўся ў 1908 - 1911 гг., у ліцэі — у 1911 - 1916 гг.

Матэрыялы фонду “Сялянскі пазямельны банк” маюць дачыненне да прафесійнай дзейнасці Адама Ягоравіча Багдановіча. Бацька паэта працаваў у банку з 1892 г., спачатку ў Гродзенскім адзяленні Сялянскага пазямельнага банка (1892 - 1896), а потым Ніжагародскім (1896 – 1908), Праслаўскім (1896-1917). Некалькі гадоў таму ў супрацоўнікаў Літаратурнага музея Максіма Багдановіча была магчымасць пазнаёміцца з некаторымі справамі Цэнтральнага архіва Ніжагародскай вобласці, якія захоўваюцца ў фондзе “Ніжагародскае аддзяленне Сялянскага пазямельнага банка”. Як вынік на падставе дакументаў фонду былі ўстаноўлены новыя факты жыцця сям’і Багдановічаў, Гапановічаў і Галаванаў у Ніжнім Ноўгарадзе. Магчыма меркаваць, што матэрыялы фонду “Сяляскі пазямельны банк” Дзяржаўнага архіва Праслаўскай вобласці такгама могуць утрымліваць важныя дакументы, якія патрабуюць вывучэння.

Дзякуючы калегам з Дома-музея Максіма Багдановіча (Праслаўль) і Дзяржаўнага архіва Праслаўскай вобласці супрацоўнікі мінскага музея паэта маюць магчымасць працаваць з электроннымі копіямі атэстатаў сталасці гімназістаў Праслаўскай мужчынскай гімназіі.

Вядома, што М. Багдановіч скончыў гімназію ў 1911 г. Пра гады навучання досыць падрабязна распавялі ва ўспамінах бацька Адам Багдановіч (“Матэрыялы да біяграфіі Максіма Адамавіча Багдановіча”), Дзіядор Дзябольскі (“Старонкі ўспамінаў”), Ціхан Годнеў (“Браты Багдановічы”). Гэтыя матэрыялы ўвайшлі ў зборнік “Шлях паэта” [4].

Адам Багдановіч ва ўспамінах называе толькі аднаго аднакласніка сына па Праслаўскай мужчынскай гімназіі - Дзіядора Дзябольскага. У свой час даследчыкам удалося адшукаць Д. Дзямбольскага, атрымаць ад яго нават сведчанні, у якіх гучалі імёны яшчэ некалькіх аднакласнікаў М. Багдановіча, у тым ліку Мікалая Какуева і Івана Лілеева. Сёння вядомы некаторыя біяграфічныя звесткі пра іх, у фондах Літаратурнага музея Максіма Багдановіча захоўваюцца артэфакты, звязаныя з імі і іх сем’ямі. Ціхан Годнеў, адзін з аднакласнікаў беларускага паэта, пісаў, што “самымі бліжэйшымі яго [М. Багдановіча] сябрамі ў класе былі гімназісты Дзябольскі, Арлеанскі і Ушакоў” [4, с. 102]. Асоба Дзіядора Дзябольскага добра вядомая беларускім даследчыкам, ёсць падрабязная біяграфія, музейныя супрацоўнікі падтрымліваюць стасункі з яго нашчадкамі. Пра двух іншых згаданых сяброў

М. Багдановіча да нядаўняга часу не было ніякай інфармацыі (толькі прозвішчы).

Сярод атэстатаў сталасці, што захоўваюцца ў архіве, ёсць дакумент [5], выпісаны на імя Арлеанскага, сябра М. Багдановіча. У атэстаце гімназіста, акрамя прозвішча, утрымліваецца іншая інфармацыя – Арлеанскі (Орлеанский) Сяргей Уладзіміравіч, сын надворнага саветніка, праваслаўнага веравызнання. Нарадзіўся ў горадзе Варнавіна Кастрамской губерні 20 чэрвеня 1889 г., у жніўні 1905 г. залічаны ў Яраслаўскую мужчынскую гімназію імя Аляксандра І, скончыў яе, як і М. Багдановіч, 1 чэрвеня 1911 г. Пры выдатных паводзінах атрымаў чатыры балы па філасофскай прапедэўтыцы, матэматыцы, фізіцы; тры балы – па ўсіх астатніх прадметах.

Гэтыя звесткі, асабліва імя, імя па бацьку, дата і месца нараджэння, паходжанне, – вельмі каштоўныя. Яны дазваляюць весці актыўныя пошукі інфармацыі пра Уладзіміра Арлеанскага, а таксама пра яго нашчадкаў, у якіх могуць захоўвацца сямейныя архівы, фотаздымкі, рэчы, дакументы і г.д.

На жаль, пра другога аднакласніка і найлепшага сябра Максіма Баглановіча, якога называе Ц. Годнеў, інфармацыі няма. Атэстат сталасці адсутнічае, гэта можа сведчыць пра тое, што гімназіст Ушакоў застаўся на другі год і скончыў гімназію пазней, чым М. Багдановіч, сябра мог кінуць вучобу і не атрымаць атэстат сталасці. Аднакласнік паэта мог пераехаць у іншы горад, працягваць навучанне ў іншай установе.



*Паштоўка “Яраслаўская мужчынская гімназія".*
*З фондаў Літаратурнага музея Максіма Багдановіча.*

Ёсць яшчэ адна версія, якая не тычыцца самога гімназіста Ушакова, а звязана з аўтарам успамінаў пра М. Багдановіча, што з’явіліся ў друку праз пяцьдзясят пяць гадоў пасля заканчэння ім гімназіі. Першая публікацыя - у часопісе “Маладосць”, з пазнакай “Літаратурны запіс Н. Ватацы” [6], таму мог памыліцца і Ц. Годнеў, называючы прозвішча аднакласніка, і Н. Ватацы пры апрацоўцы матэрыялаў (у спісе ёсць падобнае па гучанні прозвішча

“Паўлушкоў”). Магчыма, атэстат сталасці Ушакова адсутнічае ў Дзяржаўным архіве Яраслаўскай вобласці па іншых прычынах.

Усяго ў фондзе № 557 Дзяржаўнага архіва Яраслаўскай вобласці захоўваецца 69 атэстатаў сталасці гімназістаў Яраслаўскай мужчынскай гімназіі імя Аляксандра I, выпускнікоў 1911 г. Вядома, што было два класы - асноўны і паралельны, на жаль, гэтая каштоўная інфармацыя ў дакументах не адлюстравана, таму сёння нельга сказаць, хто з’яўляўся непасрэдным аднакласнікам М. Багдановіча, а хто вучыўся ў паралельным класе. Дакладныя звесткі толькі пра гімназістаў Ц. Годнева, У. Арлеанскага, М. Какуева – аднакласнікаў паэта, Д. Дзябольскі вучыўся ў паралельным класе.

Увогуле, атэстат сталасці як гістарычны дакумент падаецца нам вельмі цікавым для аналізу, таму што ўтрымлівае шмат цікавай і карыснай інфармацыі. Яго атрыманне давала гімназістам права паступаць у вышэйшыя навучальныя ўстановы Расійскай імперыі. У атэстатах яраслаўскіх гімназістаў можна вызначыць наступныя важныя пазіцыі: прозвішча, імя, імя па бацьку; паходжанне, веравызнанне; месца і дата нараджэння; даты паступлення і заканчэння гімназіі; паводзіны; вучэбныя прадметы і балы (па пяцібальнай сістэме); поспехі ў асобных навуках; узнагароджанне медалём; подпісы адказных асоб; нумар і дата выдачы дакумента.

Атэстаты запаўняліся і рэгістраваліся ў алфавітным парадку, незалежна ад таго, у асноўным ці паралельным класе вучыўся гімназіст. У архіўным фондзе дакументы таксама захоўваюцца па алфавіце.


АТТЕСТАТЪ ЗРѢЛОСТИ

Данъ сей сыну колл. асессора Максиму Адамовичу Богдановичу

православн. вѣроисповѣданія, родившемуся въ г. Минскѣ, 27 ноября 1891 года

въ томъ, что онъ, вступивъ въ Ярославскую гимназію въ январѣ 1909 года, при отличномъ поведеніи обучался по 1-ое іюня 1911 года и кончилъ полный восьмиклассный курсъ, при чемъ обнаружилъ нижеслѣдующія познанія:

| ПРЕДМЕТЫ ГИМНАЗИЧЕСКАГО КУРСА: | Отмѣтки, выставленныя въ Педагогическомъ Совѣтѣ на основаніи § 71 Правилъ объ испытаніяхъ учениковъ гимназій вѣдомства Министерства Народнаго Просвѣщенія. |
|---|---|
| Законъ Божій | 3 (удовл.) |
| Русскій языкъ съ церковно-славянскимъ и словесность | 5 (отлично) |
| Философская пропедевтика | 4 (хорошо) |
| Латинскій языкъ | 3 (удовлетворительно) |
| Греческій языкъ | |
| Математика | 3 (удовл.) |
| Математическая географія | 3 (удовл.) |
| Физика | 4 (хорошо) |
| Исторія | 4 (хорошо) |
| Географія | 4 (хорошо) |
| Законовѣдѣніе | 5 (отлично) |
| Нѣмецкій языкъ | 3 (удовлетворительно) |
| Французскій языкъ | 3 (удовлетворительно) |

На основаніи чего и выданъ ему сей аттестатъ зрѣлости, предоставляющій ему всѣ права

*Атэстат сталасці Максіма Багдановіча, копія.*
*З фондаў Літаратурнага музея Максіма Багдановіча.*

Што тычыцца паходжання гімназістаў, то ў выпуску Яраслаўскай мужчынскай гімназіі 1911 г. былі прадстаўлены ўсе саслоўі і сацыяльныя слаі: вучыліся сыны дваран (3), хрысціянскага духавенства (святароў – 4, протаіерэяў – 3), гарадскіх абывацеляў (29), сельскіх абывацеляў (5). У сваю чаргу саслоўе "гарадскія абывацелі" складалася з патомных ганаровых грамадзян (9), асабістага ганаровага грамадзяніна (1), купца (1), мяшчан (19). Асобна вылучым бацькоў, што знаходзіліся на ваеннай службе: падпалкоўнік (1), капітан (1). Яшчэ адна катэгорыя – бацькі, якія былі на дзяржаўнай службе, як, напрыклад, А. Багдановіч - калежскі асэсар, што адпавядала VIII чыну Табеля аб рангах. Сюды адносіліся сапраўдны стацкі саветнік (2), стацкі саветнік (7), калежскі саветнік (4), на дворны саветнік (2), калежскі асэсар (1), тытулярны саветнік (1), калежскі сакратар (1), губернскі сакратар (3), калежсхі рэгістратар (1).

Гэтая інфармацыя дазваляе па-іншаму паглядзець на створаны за гады савецкай улады стэрэатып аб магчымасці навучання ў гімназіі толькі дзяцей дваран і памешчыкаў. Аналіз дакументаў паказвае, што ў Яраслаўскай мужчынскай гімназіі займаліся прадстаўнікі ўсіх саслоўяў, у тым ліку дзеці мяшчан і сялян. Крытэрыі адбору дзяцей былі іншыя: веды і здольнасці гімназістаў, а таксама магчымасць бацькоў плаціць за навучанне.

Паводле веравызнання пераважалі праваслаўныя гімназісты (67); Арон Майсеевіч Гідон быў іўдзеем, Фрыдрых Адамавіч Маркер – евангелістам-лютэранінам. Сітуацыя ў Яраслаўлі кардынальным чынам адрознівалася ад той, што назіралася на тагачасных беларускіх землях, дзе колькасць навучэнцаў праваслаўнага і іўдзейскага веравызнання была прыкладна аднолькавай.

Выпускнікоў 1911 г. можна размеркаваць паводле месца нараджэння наступным чынам. Большая палова хлопчыкаў нарадзілася ў Яраслаўлі (28), вёсках і сёлах (7), а таксама гарадах Яраслаўскай губерні (9) (Растоў, Рыбінск, Любім, Малога). Астатнія гімназісты былі выхадцамі з іншых рэгіёнаў Расійскай імперыі і паходзілі з Масквы, Мінска (М. Багдановіч), Вільні, Ялты, Табольска, Іркуцка, а таксама з іншых гарадоў і вёсак розных губерняў (Кастрамская, Калужская, Арлоўская, Херсонская, Казанская і інш.). Гэтая інфармацыя, па-першае, ускосна сведчыць пра рух насельніцтва ў Расійскай імперыі на пачатку XX ст., па-другое, падкрэслівае імкненне да асветы, жаданне атрымаць гімназічную адукацыю, незалежна ад месца жыхарства.

Пра што можа расказаць дата нараджэння гімназістаў, дакладней, год нараджэння? Вядома, што М. Багдановіч паступіў у першы клас Ніжагародскай мужчынскай гімназіі, калі яму было амаль 11 гадоў, і гэта

было распаўсюджанай практыкай. Аналіз інфармацыі атэстатаў сталасці паказвае, што сярод выпускнікоў Яраслаўскай гімназіі было 20 равеснікаў М. Багдановіча, маладзейшых за яго на год – 24 чалавекі, на два гады – 12. Значна менш было тых, каму на момант заканчэння навучальнай установы споўніўся 21 год (6), 22 гады (4, сярод іх і У. Арлеанскі) і 23 гады (2).

Дата паступлення ў гімназію таксама вельмі важная, бо дапамагае скласці ўяўленне пра тое, як ішоў працэс навучання, калі праводзілася залічэнне хлопчыкаў у першы клас гімназіі альбо перавод у наступны. Класічнае гімназічнае навучанне доўжылася восем гадоў, Яраслаўская гімназія не была выключэннем. Таму ў атэстатах сталасці вучняў павінна прысутнічаць дата паступлення – жнівень 1903 г. У рэальнасці сустракаецца разбег у гадах (з 1899 да 1909 г.), таксама, акрамя жніўня, можна сустрэць і іншыя месяцы. У гэтую навучальную ўстанову паступала (па гадах) наступная колькасць гімназістаў: 1899 – 4, 1900 – 3, 1901 – 11, 1902 – 29, 1903 – 17, 1904 – 4, 1905 – 2, 1906 – 5, 1907 – 1, 1908 – 1, 1909 – 1 (М. Багдановіч). Тыя, хто паступіў у 1903 г., вытрымалі ўсе экзамены пры пераводах з класа ў клас. Гімназісты, якія паступілі да 1903 г., хутчэй за ўсё, атрымлівалі нездавальняльныя балы на экзаменах і заставаліся на другі год. Выпускнікі, у чыіх атэстатах пазначана дата паступлення пасля 1903 г., – прыезджыя, пераведзеныя з іншых гімназій (Яраслаўля і іншых гарадоў Расійскай імперыі). Так, напрыклад, М. Багдановіч быў пераведзены з Ніжагародскай мужчынскай гімназіі; падрабязна пра складанасці гэтага пераводу пісаў ва ўспамінах А. Багдановіч [4, с. 36].

Дата заканчэння гімназіі – 1 чэрвеня 1911 г. (аднолькавая ва ўсіх дакументах), як і дата, калі выпісвалі атэстаты, – 4 чэрвеня 1911 г., нумары дакументаў з 955 да 1024. У выпуску 1911 г. ёсць атэстат за № 1000, яго атрымаў Мікалай Мікалаевіч Рэмер. Прычым дакумент з такой “прыгожай” лічбай выпісаны ў алфавітным парадку запаўнення атэстатаў, гэты гімназіст нічым не вылучаўся сярод аднакласнікаў і не ўзнагароджваўся медалём, наадварот, большая частка яго адзнак – “здавальняльна”.

Цікава, што ва ўсіх атэстатах прысутнічае яшчэ адзін аднолькавы запіс пра выдатныя паводзіны. Ва ўспамінах Адама Ягоравіча знаходзім адваротную характарыстыку паводзінаў М. Багдановіча, зразумела, што і іншыя гімназісты ў гэтым плане мала чым ад яго адрозніваліся: «Максім няўважліва слухаў настаўнікаў і адказы аднакласнікаў. Размаўляў з суседзямі, смяяўся – смяяўся над сваімі адказамі і адказамі сяброў; гуляў у пёрышкі ці шашкі. Спазняўся ці сыходзіў раней, займаўся “сваімі справамі”» [4, с. 37].

Аднолькавы ва ўсіх атэстатах і спіс прадметаў, па якіх выстаўляліся балы. Былі дысцыпліны, якія і сёння вывучаюцца ў школах, а таксама тыя, што сышлі ў небыццё. Напрыклад, Закон Божы, які знаёміў з Бібліяй, гімназісты вывучалі малітвы і практыку царкоўнага жыцця. Філасофская прапедэўтыка - папярэдні, уводны курс у філасофію; матэматычная геаграфія – прадмет, дзе вучылі вызначаць становішча любога пункта зямнога шара. Веды ацэньваліся па пяцібальнай сістэме, для атрымання залатога медаля неабходна было мець "выдатна" па ўсіх дысцыплінах, для срэбранага дапускаліся два балы "добра".

Залатым медалём былі ўзнагароджаны тры выпускнікі 1911 г. (Васільеў, Поснікаў, Собалеў), срэбраным – 10 (Баршчэўскі, Буякоў, Годнеў, Князеў, Ламцёў, Лачынаў, Чапурскі, Чухін, Шчарбакоў Барыс, Шчарбакоў Сяргей). У атэстатах некаторых гімназістаў, узнагароджаных медалём, сустракаецца запіс пра асаблівыя поспехі ў тых ці іншых навуках: матэматыка (Баршчэўскі, Васільеў, Лачынаў, Чухін, Шчарбаковы Барыс і Сяргей), славесныя навукі (Буякоў, Поснікаў), гісторыя (Князеў). Усе атэстаты сталасці падпісаў Уладзімір Аляксеевіч Андроннікаў, калежскі саветнік, інспектар Яраслаўскай мужчынскай гімназіі імя Аляксандра I.

Такім чынам, атэстат сталасці – юрыдычны дакумент, які сведчыць, што яго ўладальнік праслухаў поўны курс навук у гімназіі, паспяхова здаў выпускныя экзамены і мае права паступлення ў вышэйшую навучальную ўстанову. Гэты дакумент выконвае некалькі важных функцый, у тым ліку прававую, сацыяльную, інфармацыйную, культурную. Аднак для музейнага супрацоўніка, даследчыка на першы план выходзіць іншая функцыя атэстата сталасці: ён выступае як важная гістарычная крыніца. Вывучаючы атэстаты сталасці выпускнікоў Яраслаўскай мужчынскай гімназіі 1911 г., мы знаходзім інфармацыю пра Максіма Багдановіча, яго сяброў, аднакласнікаў. Звесткі з атэстатаў сталасці пра паходжанне, дату і месца нараджэння могуць дапамагчы ў пошуку аднакласнікаў беларускага паэта і іх ідэнтыфікацыі.

## Спіс літаратуры


1. Интернет-портал Архивной службы Ярославской области [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.yar-archives.ru/web-archive/index.php?act=opis&fund=24685&opis=10000056414.
2. Интернет-портал Архивной службы Ярославской области [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.yar-archives.ru/web-archive/index.php?act=fund&fund=24699.
3. Интернет-портал Архивной службы Ярославской области [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.yar-archives.ru/web-archive/index.php?act=fund&fund=24644.

4. Шлях паэта**.** Успаміны і біяграфічныя матэрыялы пра Максіма Багдановіча: зб. / уклад. Н. Ватацы. - Мінск: Маст. літ., 1975.
5. ДАЯВ**.** - Фонд 557. - Воп. 1. - Спр. 90. - Арк. 35 - 35 адв.
6. Годнеў, Ц. Браты Багдановічы : успаміны таварыша па гімназіі / Ц. Годнеў; літаратурны запіс Н. Ватацы // Маладосць. - 1966. - № 12. - С. 10.

Ірына Мышкавец,
вядучы навуковы супрацоўнік Літаратурнага музея Максіма Багдановіча.